## КАЗКА “ЗОРКАВЕД І ЗОЛАТА” Л. РУБЛЕЎСКАЙ У СУСВЕТНЫМ КУЛЬТУРНЫМ ПОЛІ

*В.Ф. Падстаўленка*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Разнастайная ў ідэйна-мастацкіх рашэннях творчая спадчына Людмілы Рублеўскай уключае і яркія творы для дзяцей, напрыклад, казку “Зоркавед і золата”. Яе дзівосны свет пабудаваны ў моцнай карэляцыі з сусветнымі міфалагічнымі, уласна літаратурнымі і фальклорнымі традыцыямі. Акрэсліць значнасць міфалагічных, літаратурных і народна-паэтычных матываў у мастацкай структуры названай казкі з’яўляецца мэтай нашага артыкула. Праведзенае даследаванне мае актуальнасць, бо пашырае кола навукова-крытычных прац, прысвечаных як паэтыцы твораў Людмілы Рублеўскай, так і беларускай аўтарскай казцы ўвогуле. У артыкуле канцэнтруецца ўвага на дадатковых сімвалічных акцэнтах у рэпрэзентаваных падзеях і вобразах, што дазваляе надаць большай выразнасці ідэйна-мастацкаму патэнцыялу згаданага твора.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам нашага даследавання паслужыла казка “Зоркавед і золата” Людмілы Рублеўскай. Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, кампаратыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Цікава заўважыць, што першапачаткова “Зоркавед і золата” быў фрагментам рамана Рублеўскай “Авантуры Пранціша Вырвіча, канфедэрата і здрадніка”, але дадзеная гісторыя мае пэўную сюжэтную завершанасць, хранатопную адрознасць ад цэнтральных перыпетый і ідэйную самастойнасць. З гэтай прычыны невыпадкова на сайце пісьменніцы “Хронікі сада камянёў” казка прэзентуецца як самастойны мастацкі прыклад.

У невялікім падзейным ланцугу твора адчуваюцца ўплывы вядомых у агульнасветавай мастацкай прасторы сюжэтаў пра дзівакаватых мысляроў, што ўсё жыццё блукалі ў варунках глыбіннага пазнання ісціны, а дзеля глабальных адкрыццяў гатовыя былі не толькі на добраахвотнае самотнае існаванне, але і на большыя асабістыя ахвяры.

Менавіта такім і падаецца пратаганіст дадзенай казкі: “ён быў шчаслівы хадзіць у лахманах і есці адну параную рэпу, абы пры гэтым у яго меліся кнігі і магчымасць лічыць зоры ды аблокі. Ото ж любіў ён лічыць зоры ды аблокі! Колькі разоў ідзе, задраўшы галаў, спатыкаецца ды падае ў брудную калюжыну, месцічаў весяліць. Так што празвалі яго Зоркаведам.

Але на насмешкі ён нават не зважаў, бо акрамя мудрасці кніжнай ды навук розных нічым не цікавіўся” [1]. Нават з гэтай цытаты відавочна вызначаюцца характарыстычныя дамінанты героя: яго абыякавасць да матэрыяльнага боку жыцця, апантанасць кніжнымі ведамі, жаданне спасцігнуць вышэйшыя быційныя сферы, рамантычнасць, латэнтны канфлікт з іншымі на падставе светапоглядных разыходжанняў. Заўважым, што сярод літаратуразнаўцаў Людміла Рублеўская лічыцца спадкаемніцай традыцый Уладзіміра Караткевіча, і слушнасць такога меркавання даказваецца блізкасцю іх шматжанравых мастацкіх сістэм. Дадатковым доказам гэтага служыць і прыведзенае апісанне пратаганіста Рублеўскай, які тыпалагічна збліжаецца з адпаведнымі караткевічаўскімі героямі, у тым ліку і з наіўным, рамантычным Янкам з казкі “Чортаў скарб”.

Вернемся на вобраза Зоркаведа. Яго безвыніковыя спробы здзейсніць адкрыцці з метамарфозамі рэчываў прымушаюць героя звярнуцца па матэрыяльную дапамогу да мясцовага ўладара, які пазіцыянуецца ў творы як носьбіт Зла: “пан, багаты, як цмок,

што нават яблыкі ў сваім садзе загадаў пазалаціць” [1]. У гэтым моманце мастацкія рэаліі Рублеўскай нагадваюць вядомыя сюжэты кшталту “Фаўста” І.В. Гётэ альбо народных казачных аповедаў, дзе пратаганісты прымусова слугавалі антыгероям і выконвалі іх неверагодныя загады (“Іван Царэвіч і шэры воўк”, “Маладзільныя яблыкі” і інш). Жаданне пана ў гэтай казцы таксама было фантастычным – атрымаць у якасці падарунка Сільфіду.

Такім чынам у твор уводзіцца яшчэ адзін важны персанаж міфалагічнага паходжання. Дадзены вобраз дастаткова нечаканы і экзатычны для беларускага культурнага поля, таму неабходна дадаткова раскрыць яго сутнасць. Знаёмства грамадскасці з чароўным народам сільфаў адбылося ў многім дзякуючы Піліпу Аўрэолу Парацэльсу (1493–1541), славутаму медыку, алхіміку, філосафу, тэолагу. Ён у 1536 годзе выдаў “Кнігу аб німфах, сільфах, пігмеях, саламандрах, гігантах і іншых духах” [2]. У ёй вучоны распавёў, што кожная з чатырох стыхій (Зямля, Агонь, Паветра і Вада) населена агромністай колькасцю незвычайных істот (элементаляў, прыродных духаў), асноўныя з якіх згаданыя ў назве працы.

У адпаведнасці з прыведзенай інфармацыяй, сільфы (сільфіды) – стварэнні Паветра, іх дзейнасць звязаная з рухам аблокаў, мадэляваннем сняжынак і нават з раслінным квітненнем. Могуць выглядаюць як анёлы, феі, маленькія крылатыя эльфы, здатныя ператварацца ў аблокі, туман. Вонкава падобныя да людзей, але чалавечы свет з яго імператывамі ім чужы. Сільфы могуць становуча ўплываць на творчых, таленавітых асоб, натхняць іх на адкрыцці і шэдэўры, актывізуючы інтуіцыю і крэатыўнасць.

Адзначаныя характарыстыкі сугучныя загадкавай рэцэпцыі вобраза прыгажуні з казкі Л. Рублеўскай. У маргінальнай свядомасці Зоркаведа, “затуманенай” марнымі навуковымі росшукамі і ўзнёслымі марамі, Сільфіда паўстае энігматычным стварэннем з пэўнай зямной канатацыяй: “вырашыў – не аддасць ён Сільфіду сквапнаму пану. Хай лунае яна на волі, бо нічога прыгажэйшага Зоркавед не бачыў ні ў аблоках, ні ў зорным небе. І ўсё роўна яму стала, ці гэта дзяўчына з неба, ці з суседняга двара. Бо яна заставалася для яго недасяжнай, як зоры і аблокі” [1].

Далей па імператывах казачнага жанру [3] пратаганіст змагаецца за каханне і перамагае не толькі антыгероя, але і ўласныя аберацыйныя перакананні ў тым, што шчаслівым нібыта магчыма стаць пасля атрымання абсалютных ведаў. А ў творы прапагандуецца думка, простая, але апрыёры відавочная і глыбокая: шчасце – побач, і каб убачыць яго, варта толькі ўважліва паглядзець на наш зямны свет!

**Заключэнне.** Праз гэты нескладаны сюжэт Людмілай Рублеўскай сцвярджаюцца бездакорныя ў сваёй значнасці ідэі аб жыццёвых каштоўнасцях і чалавечых прыярытэтах, а яе героі і іх гісторыі самабытна пашыраюць казкавую прастору ў сусветным культурным полі.

1. Рублеўская, Л. Зоркавед і золата / Л. Рублеўская // Хронікі сада камянёў. Сайт пісьменніцы Людмілы Рублеўскай. – URL: http://lir-book.by/ (дата звароту: 06.01.2024).

2. Парацельс Книга о нимфах, сильфах, пигмеях, саламандрах, гигантах и прочих духах / Парацельс. – URL: https://graphicdesign.ucoz.ua/ files/booksfiles/PARACELSUS.pdf (дата звароту: 06.01.2024).

3. Крикливец, Е.В. Фольклорно-мифологические мотивы в русской и белорусской модернистской повести второй половины XX века / Е.В. Крикливец // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XXIII (70) Региональной науч.-практ. конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 15 февраля 2018 г. : в 2 т. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2018. – Т. 1. – С. 165-166. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/14923 (дата звароту: 06.01.2024)